# З'ЕЗД МАЙСТРОЎ ШКОЛЫ МАРКСА-ЛЕНІНА-СТАЛІНА

## У залах тэатра

У Менск прыехалі слаўныя госці... На франтоне будынка беларускага тэатра «Усебеларускі з'езд настаўнікаў-ударнікаў БССР».

**2-га лютага.** Надвячорак. Людскі струмень бесперапынна ўліваецца ў залы. Перш за ўсё ўвагу дэлегатаў прыцягвае выстаўка дасягненняў совецкай палітэхнічнай школы Беларусі. У невялічкім пакоі шматлікія экспанаты ярка адлюстроўваюць работу совецкай школы, канкрэтна і ўсебакова паказваюць якой стала яна ў эпоху другой пяцігодкі.

Вялікі МАРКС некалі пісаў:

«Пад адукацыяй мы разумеем тры рэчы: 1. Разумовую адукацыю, 2. фізычнае развіццё, якое даюць гімнастычныя і ваенныя практыкаванні, 3. палітэхнічнае выхаванне, якое знаёміць вучняў з агульнымі навуковымі асновамі ўсіх вытворчых працэсаў, адначасова дае дзіцяці, падлетку практычныя навыкі і ўменне абыходзіцца з прасцейшымі інструментамі ўсіх вытворчасцяў».

Мы сведкі шчаслівай эпохі, калі гэта меркаванне геніяльнага тэарэтыка соцыялістычнага грамадства стала **сапраўднасцю.** Выстаўка ілюструе гэтыя новыя бакі школы, створанай дыктатурай пролетарыята, якая выхоўвае актыўных і свядомых будаўнікоў соцыялізма. Вось раздзел **«Мова і літаратура».** Мы памятаем старую школу, у якой вывучэнне гэтай галіны зводзілася да зазубрывання блытаных правіл. А ў совецкай школе... Перад намі сшыткі ўсіх груп семігодкі розных школ. Ва ўсіх бачым адну рысу — выключная пісьменнасць, чыстата, прыгожасць. Вывучэнне мовы і літаратуры развівае светапогляд дзіцяці і яго творчыя здольнасці. Гэта сцвярджае часопіс Хойніцкай ШКМ «Юны літаратар», альманахі Крупскай ШКМ «Уздым», зборнікі твораў вучняў Новабеліцкай чыгуначнай ФЗС імя Молатава, Суражскай ФЗС ды інш. Тэма іх твораў: класавая барацьба, соцыялістычнае будаўніцтва і вучоба ў совецкай палітэхнічнай школе. У аддзеле **«Прыродазнаўства»:** акварыўмы, гербарыі, вырашчаныя расліны, дыяграмы. Найяскравейшым кутком на выстаўцы з'яўляецца аддзел **«Фізіка і матэматыка».** Адлюстраваныя веды ў гэтых галінах, праца ў палітэхнічных майстэрнях адкрываюць для юных грамадзян краіны советаў шырокія гарызонты для творчай работы па стварэнню матэрыяльных каштоўнасцяй. Вось мы бачым, зроблены з выключнай акуратнасцю і дакладнасцю вучнямі школы «Комінтэрн» (Гомель), набор слесарных інструментаў. Вось бліскуча зробленая мадэль паравоза, мадэль складанага пад'ёмнага крана. Гэта зрабіў вучнёўскі калектыў **Асіпавіцкай ФЗС.** Мадэль аднацыліндравай паравой машыны — справа рук вучняў адной з вясковых школ **Суражскага раёна.** Шмат радыё-прыёмнікаў і розных прылад, пабудаваных вучнямі ў працэсе вывучэння адпаведных раздзелаў фізікі. Совецкая палітэхнічная школа выхоўвае вынаходцаў і майстроў, людзей, якія здольны будуць выкарыстаць усе сілы і сродкі прыроды на службу соцыялізма.

## Слухалі даклад старшыні СНК

Слаўныя людзі нашай краіны — ўдарнікі школы Маркса-Леніна-Сталіна, якія выхоўваюць новае пакаленне большэвікоў, з'ехаліся для абмена вопытам барацьбы за стварэнне палітэхнічнай школы, вызначэння шляхоў рэалізацыі ганаровай задачы, пастаўленай партыяй перад школай у эпоху пабудовы бяскласавага грамадства.

З дакладам **аб выніках XVII партз'езда і задачах настаўніцтва** — па першаму і асноўнаму пытанню работы з'езда настаўнікаў-ударнікаў — выступіў **старшыня СНК БССР тав. Галадзед.**

З надзвычайнай напружанасцю і ўвагай, не раз перарываючы даклад бурнымі воплескамі праслухалі дэлегаты яркі і падрабязны расказ аб работах і значэнні гістарычнага з'езда пераможцаў. Тав. Галадзед падрабязна спыніўся на становішчы і далейшых задачах совецкай палітэхнічнай школы. Прывёў шмат прыкладаў яшча дрэннай работы паасобных настаўнікаў, і школ, якія ганьбяць ганаровае імя совецкага настаўніка і школы.

У гэтым раздзеле даклада тав. Галадзеда фігуравалі **Спаўнінская ФЗС, Круглянская школа (Талачынскага раёна,** паасобныя школы **Дрысенскага, Жыткавіцкага** і інш. раёнаў. Тав. Галадзед указаў на непісьменнасць — і тэхнічную і палітычную — сярод некаторай часткі настаўніцтва на тое, што часам у рады совецкага настаўніцтва пападаюць такія людзі, як **Казура** (Бягомльскі раён), якому не толькі нельга даручыць выхаванне нашай змены, але і наогул нельга дазволіць працаваць на адказных работах у совецкіх установах.

Трапыхалі белакрылымі галубамі блакноты дэлегатаў. Кожны з іх — лепшы з лепшых настаўнікаў раёна — запісваў практычныя ўказанні і

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь